PolotskSU



**MYTHOLOGICAL FOLKLORE PROSE AS A FORM OF REFLECTION OF THE ARCHAIC UNDERSTANDING OF THE WORLD (TO THE PUBLICATION OF MYTHOLOGICAL STORIES OF THE PSKOV-BELARUSIAN BORDERLAND)**

N. BOLSHAKOVA, G. PLOSHCHUK

*The article is devoted to the results of the research of the complex of expedition texts of non-fabulous folklore prose of the southern and south-eastern historical and cultural zones of Pskov region, bordering the territory of Belarus. The tradition of mythological stories is revealed on the material of more than 350 texts from the Pskov folklore and ethnographic archive. The collection of expedition texts and their scientific description are presented in the published monograph "Mythological Stories of the Pskov-Belarusian Borderland" (Pskov, 2021). The article introduces the basic principles of the publication of non-fabulous folklore prose of this region, on the basis of authentic narrative discourse reveals the features of the mythological consciousness of the bearers of the old tradition, shows signs of the transformation of cultural and linguistic forms by the end of the 20 – beginning of the 21 century. The article focuses on the theme of childhood in the discourse of mythological narrative. The involvement of children in the mythological sphere, the ways of mastering the local mythological tradition and the world picture presented by the younger generation are shown in it.*

***Key words:*** *mythological stories, Pskov-Belarusian frontier, curses, cursed children, mythological consciousness.*

УДК 39.01(=161.3)+39.01(=172)](091)

**БЕЛАРУСЫ І ЛІТОЎЦЫ НА ЭТНАГРАФІЧНЫХ КАРТАХ XIX СТАГОДДЗЯ**

**Внуковіч Ю.І.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*У артыкуле разглядаецца выяўленне беларусаў і літоўцаў на этнаграфічных картах XIX ст. На прыкладзе карт П.І. Кёпена, Р.Ф. Эркерта, А.Ф. Рыціха паказаны змены ў афіцыйных практыках класіфікацыі гэтых народаў як раўназначных этнічных катэгорый.*

***Ключавыя словы:*** *беларусы, літоўцы, этнічныя карты, этнаграфія, картаграфія, этнічная катэгарызацыя, XIX ст.*

Згодна з вядомым амерыканскім тэарэтыкам нацыяналізму Б. Андэрсанам, які разглядаў нацыю як сацыяльна сканструяваную супольнасць, вылучэнне і класіфікацыя вялікіх груп людзей (на падставе пэўных прыкмет) патрабуе спецыфічных спосабаў мыслення іх адрознення і атаясамлення. Аднымі з галоўных інструментаў такога "ўяўлення" народаў, што атрымалі сваё пашырэнне ў XIX ст. у вялікіх каланіяльных дзяржавах, сталі друкаваныя карты, перапісы насельніцтва і музеі [1, с. 266–300]. Усе яны былі цесна ўзаемазвязаныя паміж сабой і аказалі непасрэдны ўплыў на распрацоўку навуковых прынцыпаў ідэнтыфікацыі, катэгарызацыі і класіфікацыі (паводле Б. Андэрсана, "граматыкі") тагачасных народаў.

Структураваць уяўленні аб этнічнай спецыфіцы тэрыторый Расійскай імперыі ў XIX ст. заклікаными былі так званыя "этнаграфічныя карты"[1]. Іх стварэнне вымагала вызначэння дакладных тэрытарыяльных межаў рассялення народаў, што, у сваю чаргу, складана было зрабіць без адпаведных статыстычных даследаванняў, а таксама без параўнальнага вывучэння спецыфічных рыс мясцовых культур, каб пасля можна было аднесці іх носьбітаў да той або іншай этнічнай супольнасці. У рэшце рэшт, даволі складаная абстракцыя адрознення і атаясамлення народаў у сярэдзіне XIX ст. атрымала сваё выразна аформленае і спрошчанае выяўленне ў выглядзе этнаграфічных карт і атласаў.

Мэта гэтага артыкула – прасачыць змены ў этнічнай катэгарызацыі беларусаў і літоўцаў на прыкладзе іх выяўлення на этнаграфічных картах XIX ст. Пры гэтым мы не ставім задачу разгледзець праблему вызначэння "этнічных тэрыторый", разнастайныя аспекты якой дастаткова дэталёва разгледжаны ў межах асобных нацыянальных гістарыяграфій, а канцэнтруем увагу на афіцыйных картаграфічных практыках фармалізацыі і кадыфікацыі этнічных катэгорый "беларусы" і "літоўцы".

Падрыхтоўка і выданне першых этнаграфічных карт Расійскай імперыі былі звязаныя з дзейнасцю магутнай навуковай установы – Рускага геаграфічнага таварыства (РГТ)[2], заснаванага ў 1845 г. у Санкт-Пецярбургу. Ужо ў 1846 г. Савет таварыства зацвердзіў прапанаваны акадэмікам П.І. Кёпенам план выдання першай этнаграфічнай карты еўрапейскай часткі Расіі і вылучыў на гэта немалыя сродкі [3, с. 8]. У 1848 г. чарнавік карты быў гатовы, а ў 1851 г. карта выйшла з друку [4]. Пасля хуткага распродажу ўсяго тыражу, у 1852 г. яна была перавыдадзена другі раз, а ў 1855 г. – трэці. Гэтая карта стала першай этнаграфічнай картай Расійскай імперыі, надрукаванай масавым тыражом [3, с. 9]. Прынята таксама лічыць, што "Этнаграфічная карта Еўрапейскай Расіі" П.І. Кёпена аказала ўплыў на ўсе наступныя расійскія і замежныя этнічныя карты і атласы [5, с. 172].

[1] У наш час карты, на якіх паказана рассяленне народаў, таксама прынята называць "этнічнымі картамі".

[2] Як вядома, дзейнасць РГТ, скіраваная ў тым ліку на вывучэнне этнічнай разнастайнасці зямель былога Вялікага Княства Літоўскага, шмат у чым была абумоўлена гістарычным кантэкстам і палітычнай кан'юнктурай: прыярытэтным для яго было вырашэнне ў першую чаргу практычных дзяржаўных задач, якія паўставалі на шляху легітымізацыі, умацавання і пашырэння расійскай улады ва ўсіх кутках імперыі. Ад самага пачатку ў цэнтры ўвагі членаў таварыства апынуліся пераважна ўсходнія славяне (у тагачаснай тэрміналогіі – "рускія"), цікавасць да іншых падданых імперыі была прыкметна меншая. Аднак важна тое, што падыход, з дапамогай якога гэтая інстытуцыя імкнулася даследаваць "рускую народнасць", як "модульны" з цягам часу быў пераняты і для вывучэння іншых этнічных груп [2, p. 46–47]. У значнай меры гэта прадвызначыла агульныя крытэрыі іх вылучэння, класіфікацыі і катэгарызацыі.

PolotskSU



Як адзначаў сам П.І. Кёпен, найвялікшыя цяжкасці пры складанні карты ў яго выклікала вызначэнне дакладных межаў рассялення літоўцаў, аб чым ён пісаў у асобна выдадзеных каментарах да яе: “Всего труднее было иметь положительныя показания о Литовцах, которых пределы и число я уже в 1827 году тщетно старался узнать хотя приблизительно” [6, с. 14]. Каб больш кваліфікавана вырашыць гэтую задачу, П.І. Кёпен паглыбіўся ў вывучэнне гісторыі, мовы і літаратуры прусаў, літоўцаў і латышоў, прапанаваўшы для іх агульную зборную назву “народы літоўскія”[1] [7, с. 3]. Апрача таго, з мэтай вызначэння не толькі этнатэрытарыяльнай мяжы, але і высвятлення лінгва-культурных адрозненняў паміж літоўцамі і беларусамі, у 1827 г. ён сабраў з 277 рыма-каталіцкіх і былых уніяцкіх парафій Віленскай, Ковенскай, Мінскай і Курляндскай губерняў звесткі пра мясцовых жыхароў і іх размоўную мову (“с образчиками их речи”) [6, с. 15]. У часе падрыхтоўкі карты, у маі 1847 г. РГТ дадаткова звярнулася да Міністэрства ўнутраных спраў з хадайніцтвам аб атрыманні ад губернатараў Паўночна-Заходняга краю спіса літоўскіх паселішчаў [3, с. 8–9]. Неўзабаве гэтыя звесткі сталі паступаць у РГТ спачатку з Ковенскай, затым з Віленскай і Гродзенскай губерняў [6, с. 15]. Усё гэта дазволіла даследчыку даволі дакладна[2] пазначыць на сваёй карце (малюнак 1) арэал “латышска-літоўскага племяні” выразнымі колерамі, што моцна кантраставалі з нерасфарбаваным фонам-пазнакай рассялення “рускіх”, г. зн. усіх разам узятых усходніх славян[3]. Апошнім супрацьпастаўляліся размаітыя *инородцы*, у спіс якіх траплялі таксама *литовцы в пространном смысле*, г. зн. балты, падзеленыя на дзве асобныя этнічныя катэгорыі: *Литву в тесном смысле* (або *Жмудь*) і *Латышей* [6, с. 31]. Вылучыўшы такім чынам палітычна ўплывовую катэгорыю “рускага” ад “астатняга” насельніцтва, этнаграфічная карта П.І. Кёпена візуалізавала афіцыйнае ўяўленне пра “сваяцкія сувязі” і “гістарычныя іерархіі” этнічных катэгорый насельніцтва Расійскай імперыі.




**Малюнак 1. – Фрагмент “Этнаграфічнай карты Еўрапейскай Расіі” П.І. Кёпена, выдадзенай у 1851 г.**

Больш дакладна сфарміраваць афіцыйную наменклатуру этнічных катэгорый насельніцтва Паўночна-Заходняга краю мусіў “Этнаграфічны атлас заходнерускіх губерняў і суседніх абласцей” [8], рускае выданне якога выйшла акурат у час паўстання 1863 года[4]. У адрозненні ад П.І. Кёпена, яго аўтар (таксама супрацоўнік РГТ і немец паводле паходжання) Р.Ф. Эркерт класіфікаваў мясцовае насельніцтва на большую колькасць этнічных катэгорый і падкатэгорый. Так, ён нарэшце на сваёй карце (малюнак 2) вылучыў якасным фонам у колеры беларусаў і ўкраінцаў (“маларосаў”), праўда, толькі ў якасці дзвюх асобных падкатэгорый “рускіх”, што, разам з палякамі, чэхамі і вендамі, складалі агульнае “славянскае племя” [8, Т. I]. Таксанімічна апошняму адпавядала “літоўскае племя” (“литовцы в обширном смысле слова”), якое дзялілася на

[1] Тэрмін “балты” для абазначэння гэтых народаў быў уведзены нямецкім гісторыкам і філолагам Г. Нэсельманам толькі ў 1845 г.

[2] Можна, напрыклад, адзначыць агульнае падабенства абрысаў этнічнай мяжы літоўцаў і беларусаў, вызначанай П.І. Кёпенам у сярэдзіне XIX ст. і Я.Ф. Карскім ў пачатку XX ст.

[3] Адносна гэтага факту П.І. Кёпен пакінуў каментар: “Там, где обитают Великороссияне, Малороссияне и Белоруссы, карта осталась нераскрашенною”. Аднак ніжэй, у спасылцы, дадаў: “Некоторые показания сего рода внесены мною в большие Этнографические Атласы, составленные как для Академии Наук, так и для Географического Общества. В объяснениях по губерниям эти отношения не будут оставлены без внимания” [6, с. 25].

[4] Яе першае (франкамоўнае) выданне выйшла ў Берліне ў 1862 г. Цікава, што ў замежным выданні атласа Р.Ф. Эркерт адвёў беларусам і ўкраінцам куды большую тэрыторыю чым у яго рускай рэдакцыі; у сваю чаргу ў рускай версіі, у параўнанні з франкамоўнай, большую тэрыторыю займалі палякі. На думку літоўскага гісторыка В. Пятроніса, атлас, адрасаваны заходнім еўрапейцам, павінен быў зняпраўдзіць польскую прапаганду, якая сцвярджала, што гэты край нібыта польскі; а руская версія атласа мусіла наглядна паказаць чытачу, што вялікую пагрозу ў краі ўяўляюць менавіта палякі, і такім чынам заахвочвала царскую адміністрацыю прыняць тэрміновыя антыпольскія меры [9, p. 201].

PolotskSU



ўласна літоўцаў (“литовцы в тесном смысле слова”) і латышоў (“резко отличающихся между собою и в настоящее время вероисповеданием, но еще более языком”). Падобна катэгорыі “рускіх”, літоўцы таксама былі падзелены “на две группы, довольно близкия друг другу: Литвинов и Самогитов или Жмудь, из которых последние, по своей образованности и цветущему состоянию, стоят гораздо выше первых” [8, Т. V]. Наконт розніцы паміж беларусамі і літоўцамі Р.Ф. Эркерт разважаў наступным чынам: “За исключением языка и совершенно особых, национальных и религиозных понятий, относящихся к отдаленному прошедшему, Литвины по своему внешнему образу жизни мало отличаются от смежных с ними Белоруссов, к которым они находятся в каком-то пассивном и подчиненном положении” [10, с. 69]. Такое бачанне (невыразнай) этнакультурнай адрознасці беларусаў і літоўцаў было наглядна праілюстравана і на этнаграфічнай карце: тэрытарыяльная мяжа паміж імі невыразная, нюансаваная, размытая, выглядае як стракатая мазаіка анклаваў беларускага, польскага і літоўскага насельніцтва.




**Малюнак 2. – Этнаграфічная карта заходніх губерняй Расіі, складзеная Р.Ф. Эркертам**

Р.Ф. Эркерт таксама быў адным з першых даследчыкаў, хто паспрабаваў класіфікаваць беларусаў на асобныя этнаграфічныя (“нацыянальныя”) групы. У сваёй працы “Погляд на гісторыю і этнаграфію заходніх губерняў Расіі” [10], якая выйшла ў якасці спецыяльнага дадатку да яго атласа, ён вылучыў “сапраўдных беларусаў” (“настоящие Белоруссы”), што жылі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях (а таксама на ўсход ад іх) і ва ўсходняй частцы Мінскай губерні, і беларусаў, што “самі сябе не называюць гэтым іменем”, гавораць “па-просту” і жывуць далей на захад[1]. Апошнія – паводле слоў Р.Ф. Эркерта, “каталіцкія беларусы” – мелі моцны польскі ўплыў, усяляк прыраўноўваліся ім да палякаў і супрацьпастаўляліся “велікарусам” [10, с. 66]. Словы пра іх этнічную маргінальнасць на карце наглядна мусіла пацвярджаць неверагодная колькасць ружовых плямін, што абазначалі анклавы польскага насельніцтва. Што тычыцца літоўцаў, то Р.Ф. Эркерт таксама падзяліў іх на дзве вялікія групы, “находящиеся между собою в близком родстве, а именно на Литовцев в тесном смысле слова, или Литвинов, и Жмудь” [10, с. 69]. Больш за тое, калі беларусы на ягонай карце ўсё ж такі пазначаны адным якасным фонам, то літоўцы выяўлены ў двух розных колерах, што адпаведна пазначаюць рассяленне “літвінаў” і “самагітаў” (ці “Жмудзі”) [8, Т. І]. Па-сутнасці, гэта была першая картаграфічная спроба этнаграфічнага рэгіянавання Літвы,

[1] У якасці трэцяй, найбольш апалячанай групы беларусаў Р.Ф. Эркерт асобна вылучыў яшчэ і падляшан.

PolotskSU



якая адлюстроўвала гістарычны падзел літоўцаў на дзве вялікія групы: аўкштайтаў (“сапраўдную Літву”) і жэмайтаў (“Жмудзь”).

Па даручэнні РГТ у 1875 г. вядомы этнограф і вайсковы картограф А.Ф. Рыціх падрыхтаваў і выдаў яшчэ больш дэталёвую этнаграфічную карту еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, пры складанні якой быў скарыстаны лінгвістычны прынцып класіфікацыі народаў. На ёй *беларусы* спосабам якаснага фону ўжо былі вылучаны ў асобную этнічную катэгорыю, раўназначную іншым катэгорыям, у тым ліку *літве*. Пры гэтым роднасныя ў моўным плане народы былі пазначаны ў адзінай колеравай гаме (малюнак 3). Да пачатку ХХ ст. “Этнаграфічная карта Еўрапейскай Расіі” А.Ф. Рыціха з’яўлялася галоўным вучэбным дапаможнікам па вывучэнні рассялення народаў Расійскай імперыі [2, с. 12] і, такім чынам, садзейнічала далейшай фармалізацыі і кадыфікацыі этнічных катэгорый на падставе лінгвістычнай класіфікацыі.




**Малюнак 3. – Фрагмент “Этнаграфічнай карты Еўрапейскай Расіі” А.Ф. Рыціха, выдадзенай у 1875 г.**

Цікава, што ў сваім грунтоўным даследаванні “Славянскі свет”, якое выйшла ў 1885 г., А.Ф. Рыціх змясціў асобную невялікую карту-схему Беларусі і Літвы, дзе ў большай ступені чыталіся іх знешнія контуры, а не ўнутраныя межы [10, с. 24]. На ёй (гэтаксама як і на спецыяльна выдадзенай каляровай “Этнаграфічнай карце славянскага свету”) фармальна фігуравалі толькі дзве этнічныя катэгорыі – *беларусы* і *літоўцы* (малюнак 4), пры гэтым пад апошнімі разумеліся “литовцы, жмудины и латыши” разам узятыя[1].

Такім чынам, выяўленне беларусаў і літоўцаў на этнаграфічных картах XIX ст. адлюстроўвала не толькі змены ў навуковых практыках фармалізацыі і кадыфікацыі гэтых этнічных катэгорый, класіфікаваных паводле лінгвістычнага прынцыпу, а таксама візуалізавала афіцыйнае ўяўленне пра іх іерархічныя сувязі і стасункі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Андерсон, Б. Воображаемые сообщества: размышления об истоках и распространении национализма / Б. Андерсон; пер. с англ. В.Г. Николаевой под ред. С.П. Баньковской; вступ. ст. С.П. Баньковской. – М.: Кучково поле, 2016. – 416 с.

[1] А.Ф. Рыціх, разумеючы пад “літоўцамі ў шырокім сэнсе” усіх балтаў, як і многія яго сучаснікі, лічыў, што яны з’яўляюцца старажытным адгалінаваннем славян: “Литовская ветвь, состоящая из древних пруссов – литвы, жмуди, куров и леттов и еще некоторых других племен, явилась в Европу в виде авангарда славянских переселенцев с Урала и потому, соприкасаясь постоянно с финскими и германскими народами, несколько изменилась; но история, язык, тип и древнее верование представляют веские доказательства принадлежности этого племени к славянскому народу” [12, с. 327].

PolotskSU




2. Staliūnas, D. Lenkija ar Rusija? Lietuva rusiškajame mentaliniame žemėlapyje / D. Staliūnas // Lietuvos erdvinės sampratos ilgajame XIX šimtmetyje / sudarytojas – D. Staliūnas; Lietuvos istorijos institutas. – Vilnius, 2015. – P. 29–81.
3. Псянчин, А.В. Из истории отечественной этнической картографии (по материалам ИРГО и КИПС) / А.В. Псянчин. – Уфа: ЦЭИ УНЦ РАН, 2008. – 52 с.
4. Этнографическая карта европейской России, составленная Петром Кеппеном. – Санкт-Петербург, 1851. – Рэжым доступу: https://geoportal.rgo.ru/record/1674 – Дата доступу: 07.03.2021.
5. Выскочков, Л.В. Историко-этнографические карты Северо-Запада России (конец XVIII – первая треть XX в.) / Л.В. Выскочков // Историческая этнография: Русский Север и Ингерманландия: Межвуз. сб. / Под ред. И.Я. Фроянова. – СПб., 1997. – С. 165–179.
6. Кеппен, П. Об этнографической карте европейской России / П. Кеппен. – Санкт-Петербург: Типографія Императорской Академии наук, 1852. – 40 с.
7. Кеппен, П. О происхождении, языке и литературе литовских народов / П. Кеппен // Материалы для Истории просвещения в России. – 1827, ч. 3. – С. 3–106.
8. Эркерт, Р.Ф. Этнографический Атлас западнорусских губерний и соседних областей / Р.Ф. Эркерт. – Санкт-Петербург, 1863. – 28 с.
9. Petronis, V. Constructing Lithuania: Ethnic Mapping in Tsarist Russia, ca 1800–1914 / V. Petronis. – Stockholm: Stockholm University, 2007. – 309 p.
10. Эркерт, Р.Ф. Взгляд на историю и этнографию западных губерний России (с атласом) / Р.Ф. Эркерт. – Санкт-Петербург: В тип. Дома Призрения Малолетних Бедных, 1864. – 72 с.
11. Риттих, А.Ф. Этнографическая карта Европейской России / А.Ф. Риттих. – Санкт-Петербург: Картографическое заведение А.А. Ильина, 1875.
12. Риттих, А.Ф. Славянский мир. Историко-географическое и этнографическое исследование / А.Ф. Риттих. – Варшава: Типография Варшавск. Учебнаго Округа, 1885. – 389 с.





**Малюнак 4. – Карта-схема Беларусі і Літвы паводле А.Ф. Рыціха, 1885 г.**

## BELARUSIANS AND LITHUANIANS ON ETHNOGRAPHIC MAPS OF THE 19th CENTURY

Y. VNUKOVICH


*The article examines the representation of Belarusians and Lithuanians on ethnic maps of the 19th century. On the example of maps of P. von Köppen, R. von Erkert, A.F. Rittikh shows changes in official practices of classifying these peoples as equivalent ethnic categories.*


***Key words:*** *Belarusians, Lithuanians, ethnic maps, ethnography, cartography, ethnic categorization, XIX century.*

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў". Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:**
**ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ**
**І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^1/_8$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.